— Віталька, шашок ноччу курэй задушыў, дзевяць штук... — тапталася яна ў парозе, нібы якая служанка перад панам.

— А ты дзе была тым часам?! — у мужа ажно вочы пабялелі ад гневу, і ён кінуўся на Тоню з кулакамі.

— Няўклюда! — крычаў так, што было чуваць на паўвёскі. — Мала таго, што нідзе не працуеш, то і гаспадарку як след не можаш даглядзець! Праўду мая маці некалі казала, каб з табой не жаніўся, маўляў, гэтыя, што з дыпломамі, нікуды не варты, ніякай сур'ёзнай справы ім нельга даверыць.

Пасля таго выпадку ў Тоні пачала моцна балець галава. Кабета была ўпэўнена, што гэта ад мужавых кулакоў, але нікому нічога не казала. Як і раней, упраўлялася па гаспадарцы, добра, што зімой яна была меншая. І ў агародзе не трэба было карпець. Віталь жа, як кажуць, і за ваду халодную не браўся. Прыйшоўшы з работы, мыўся і клаўся на канапу ля тэлевізара.

На згон зімы, калі ацяліліся каровы і давалі шмат малака, Тоня паехала на кірмаш у райцэнтр. Расклала на бялюткай сурвэтцы свежы тварог, дамашні сыр, масла, побач паставіла слоікі з малаком. Людзі куплялі ахвотна, і неўзабаве прылавак апусцеў. Кабета заспяшалася: праз гадзіну ў вёску ішоў аўтобус, а яшчэ трэба было ў аптэцы купіць абязбольваючых таблетак ад галавы, бо як пацягала сумкі з малочнымі прадуктамі, боль стаў вельмі моцны.

— Тоня?! — пачула яна знаёмы голас Веры Паніковай з раённай бібліятэкі. — Ледзь пазнала цябе... Хворая, ці што? Гэдак кепска выглядаеш!

— Ай, Верачка, няма каму што казаць... Галава вельмі баліць. І даўно...

— Лячылася?

— А навошта? Памру, то і ўсе пакуты закончацца. Каб ты ведала, як мне цяжка! Замучылася ў гэтай праклятай рабоце, а ёй і канца няма. Ад мужа ні дапамогі, ні спагады...

— Ці ж можна так сябе мучыць, Тонечка? Прападзі яна пропадам, тая гаспадарка і такі муж. На наступным тыдні мая сястра Каця прыедзе з курсаў. Яна неўролагам працуе ў нашай паліклініцы. Паглядзіць цябе, аналізы здасі, а калі трэба, то і ў абласную паліклініку пад'едзеш. Ты ж была ці не лепшым бібліятэкарам у раёне і вельмі прыгожай жанчынай. А цяпер? Скура ды косці, у бабульку ператварылася...

— Злая ў мяне доля, Верачка...

— Нічога, падабрэе твая доля. Паабяцай мне, што прыедзеш на наступным тыдні.

Тоня з вечара падрыхтавалася і яшчэ праз цёмнае, калі Віталь спаў, пайшла з дому. Яна не даіла кароў, не ўпраўляла іншую гаспадарку. Боль быў такі, што адбівала ад памяці, дрыжэлі рукі і ногі. На яе шчасце, у тую раніцу якраз быў аўтобус і не трэба было лавіць спадарожную машыну. Прыехаўшы ў райцэнтр на аўтастанцыю, пазваніла Веры:

— Дапамажы, калі ласка, я сама ўжо не дайду да паліклінікі...

Вера прыехала праз пару хвілін. Яна пад руку павяла Тоню па прыступках паліклінікі, а калі ўвайшлі ў калідор, няшчасная знепрытомнела.

Яна не памятала, як везлі ў абласную бальніцу, не ведала, што зрабілі аперацыю на галаве. Толькі на пятыя суткі апрытомнела і ўбачыла ля ложка Веру.

— Дзе я і што са мной? — спытала ледзь чутна.

— Ты вярнулася з таго свету і будзеш жыць доўга.

— Мне не баліць галава! Толькі крышку...

— Табе зрабілі аперацыю ў абласной бальніцы.

— А Віталь? Ён ведае?

— Ведае. Я пазваніла адразу, як табе стала дрэнна. І потым званіла, як забралі ў абласную бальніцу. Акрамя грубасці, ад яго нічога не чула. Навошта табе такі нялюдскі муж?

Калі сяброўку выпісалі з бальніцы, Вера ўзяла яе да сябе жыць, бо ў іх з мужам вялікая кватэра. Як след ачуняўшы, Тоня пайшла на работу ў раённую бібліятэку і падала на развод.

НАВІНЫ ДЗЯТЛАЎШЧЫНЫ

ПАМЕНШАЛА Ў ВЁСКАХ ВЯСЕЛЛЯЎ

У 2015 годзе небагатымі на вяселлі былі вёскі Дзятлаўскага раёна.

Найбольш шлюбаў — трынаццаць — заключана ў Жукоўшчынскім сельскім Савеце, а ў астатніх і таго менш, у некаторых — усяго па адным. Гэты факт сведчыць пра тое, што нашы вёскі імкліва выміраюць. Няма шлюбаў — не будзе дзетак, значыць, не будзе і жыцця.

ПАМАЛІЛІСЯ ЗА ІНТЭЛІГЕНЦЫЮ

Нядаўна ў дзятлаўскім касцёле адбылася святая імша, у час якой вернікі памаліліся за інтэлігенцыю.

Пра гэта ўсе былі праінфармаваны загадзя, і таму людзей прыйшло вельмі шмат.

Набажэнства ў гонар інтэлігенцыі прайшло па ініцыятыве дзятлаўскага ксяндза Здзіслава Пікулы.

НЯМА КУДЫ ВЯРТАЦЦА

Адна сям'я з вёскі Маськаўцы Дзятлаўскага раёна паехала ў госці, і якраз у гэты час у іхнім доме адбыўся пажар.

Ратаўнікі прыехалі хутка, але ўсё роўна дом быў моцна пашкоджаны агнём і цяпер патрабуе вялікага рамонту. Пашкоджана і хатняя маёмасць.

Прычына пажару высвятляецца.

Леанарда **ЮРГІЛЕВІЧ**

ОКАТИЛ ДРУГА КИПЯТКОМ

В Дятлове накануне нового года приятели принимали водные процедуры, сообщает пресс-служба УВД Гродненского облисполкома.

21-летний парень попросил друга обдать его водой. Тот взял тазик и обильно добавил из красного крана. Но, наверное, не рассчитал пропорции. Оказалось, что парень окатил спину своего друга крутым кипятком. С тяжелыми ожогами спины молодого человека госпитализировали.

В отношении приятеля потерпевшего возбуждено уголовное дело.

Владимир **ВИКТОРОВ**



Язэп ПАЛУБЯТКА
Уласны карэспандэнт «ГС» у Мастах
Адрас: 231600, праспект Юнацтва, 12/21
Email: jazep.2004@tyt.by
Тэл: +37529 126-46-92

Масты — наш край

КРЫМІНАЛ

МАСТЫ АДЗНАЧЫЛІСЯ САДЫЗМАМ



Пракурор Гродзенскай вобласці Віктар Марозаў паведаміў, што на працягу мінулага года пракуроры вобласці падалі 15 зыскаў супроць дзяцей на карысць састарэлых бацькоў ад іх імя на выплату першым аліментаў.

Сярод іншага Віктар Марозаў зазначыў, што кожны год каля 500 пенсіянераў становяцца ахвярамі злачынстваў — махлярства, крадзяжу і нават забойстваў. Пры гэтым ён звярнуў асаблівую ўвагу на неймаверны факт, які адбыўся ў Мастоўскім раёне. Тут пракуратура распачала крымінальную справу супраць сталага чалавека, які сістэматычна збіваў сваю 85-гадовую маці.

Ад пачатку гэтага года абласная камісія сацыяльнай бяспекі пачала правяраць у вобласці працу сацыяльных работнікаў. Тыдзень назад яна праводзіла праверку ў Мастоўскім раёне. Вынікі пакуль не паведамляюцца.

ЗДАРЭННІ

ТРЫ СМЕРЦІ НА ПАЖАРЫ ЗА МЕСЯЦ



На Мастоўшчыне на працягу мінулага месяца на пажарах загінулі ўжо тры чалавекі.

Праз два дні пасля трагедыі ў Лунна, 29 студзеня, сярод белага дня загарэўся дом у вёсцы Маскалі Курылавіцкага сельсавета. Праз паўгадзіны пасля паступлення паведамлення ў доме ратавальнікі знайшлі труп гаспадара 1935 года нараджэння.

Згодна з паведамленнем МНС, прычына пажару ўдакладняецца.

НАВІНЫ

МІНІСТР РАСПАВЁЎ ПРА АХОВУ ЗДАРОЎЯ, ПАКАЗАЎ КІНО І РАЗДАЎ КАЛЯНДАРЫКІ

27 студзеня ў рамках адзінага дня інфармавання Масты наведаў міністр па надзвычайных сітуацыях РБ Уладзімір Вашчанка, але пра тое папярэдне не паведамлялі мясцовыя СМІ.



ФОТА З MCHS.GOV.BY

Міністр Уладзімір Вашчанка з калектывам Мастоўскага аддзялення МНС

Для таго, каб міністр мог прачытаць інфармацыйную лекцыю перад поўнай аўдыторыяй, яму далі магчымасць сустрэцца «з працоўным калектывам» ААТ «Мастоўдрэў». Надалей, як распавядае афіцыйны партал МНС, галоўны выратавальнік краіны распавядаў аб дзяржаўнай палітыцы ў галіне аховы здароўя, абстаноўцы з пажарамі і гібеллю людзей на іх, прычынах і наступствах трагедый. Затым быў паказаны фільм «Цана імгнення». Надалей тыя, хто афіцыйна вымушаны быў прысутнічаць на сустрэчы, атрымалі памяткі аб мерах пажарнай бяспекі і кішэнныя каляндарыкі. Міністр таксама пабываў у мясцовым аддзяленні МНС, дзе сустрэўся з асабістым складам, ды распавядаў пра перспектывы развіцця службы «101», тэхнічных навінках ды іншых. Што датычыць «тэхнічных навінак» у МНС, то мінулагодні трагічны выпадак на Мастоўшчыне, калі пры пажары загінулі трое дзетак у вёсцы Нацкава, стаў прычынай іх абмеркавання. З гэтай нагоды адбыліся шматлікія мерапрыемствы ў Мінску, Гродне, Мастах. Усюды гучалі слушныя прапановы, але далей за прапановы справа не пайшла. Адна з іх — устанавіць у дамах шматдзетных сем`яў і сем`яў з немаўлятамі пажарныя апавяшчальнікі, які пры неабходнасці будуць пасылаць SMS-паведамленні бацькам і на пульт аператара МНС. Толькі і цяпер міністр не адказаў на некаторыя пытанні: калі такая прапанова будзе рэалізавана, колькі яна будзе каштаваць бацькам і хто зможа скарыстацца такою паслугаю?

У той жа дзень, калі прыязджаў міністр, у мястэчку Лунна адбыўся пажар, у якім загінула пенсіянерка. Гэта ўжо другая ахвяра пажару ў раёне ад пачатку года.

ЭКАНОМІКА

З РАБОЧЫМІ НЕ ПРАЦЯГВАЮЦЬ КАНТРАКТЫ І ПАТРАБУЮЦЬ АД ІХ ВЯРНУЦЬ АДПУСКНЫЯ



Увесну мінулага года на ААТ «Мастоўдрэў», згодна з прэзідэнцкім указам ад 2007 года «Аб мадэрнізацыі лесаапрацоўчай прамысловасці», быў здадзены ў эксплуатацыю цэх па вытворчасці пліт ПВХ, які каштаваў амаль 180 тысяч еўра.

Прадпрыемства дадзеныя яму крэдыты павінна сплаціць. Першыя шэсць вагонаў новай прадукцыі, што былі адпраўлены ў Іран, вярнуліся назад з-за нізкай якасці. Пліты пусцілі на гаспадарчыя патрэбы. На сённяшні дзень рынкі збыту ПВХ мізэрныя.

Вытворчасць, што мела даваць прыбытак, стала надалей баластам прадпрыемства. Запазычанасць не толькі перад банкамі, але і перад, скажам, электрасеткамі, давала аб сабе знаць. На працягу мінулага года на прадпрыемстве раз-пораз з-за запазычанасці адключалі электрычнасць у тым ці іншым цэху. Існавалі праблемы з выплатай заробку.

Як выйсці з такой сітуацыі? Пра скарачэнне работнікаў пачаліся размовы ў другой палове мінулага года. Тады планавалася, што пад скарачэнне трапіць 200 чалавек: у першую чаргу пенсіянеры і тыя, хто мае праблему з працоўнай дысцыплінаю. Астатніх скарачаць было праблематычна, бо, як пракаментаваў адзін са спецыялістаў прадпрыемства, «няма грошай на выплату кампенсацый». Аднак з пачаткам гэтага года звальненне па невядомых прычынах набыло масавы характар. Тым часам афіцыйнай інфармацыі пра гэта не мае ні мясцовая грамадскасць, ні самі рабочыя. Па чутках, поўнамаштабнае скарачэнне закране ад 500 да 800 чалавек. Пры ўсім тым прафсаюз прадпрыемства не выступае ў абарону рабочых нават тады, калі людзей проста выкідаюць на вуліцу ды яшчэ патрабуюць з іх грошы. Сітуацыя даходзіць да смешнага: з тых, каго звальняюць з працы пасля заканчэння кантракту, патрабуюць вярнуць адпускныя. Грошы патрабуюць з тых, хто быў адпраўлены ў адпачынак не па сваім жаданні, а па патрабаванні наймальніка. Кіраўніцтва ААТ, якое ўзначальвае Сяргей Асосаў, займае такую пазіцыю: «Нічога дзіўнага, у людзей скончыліся кантракты».

Кантрактная сістэма, прыдуманая дзяржавай, цяпер у дзеянні. Раней кантракты працягваліся аўтаматычна, а цяпер з іх дапамогаю людзей проста выкідаюць на вуліцу.

Скарачэнне не датычыць новага цэха МДФ і нарыхтоўчага, які пастаўляе яму сыравіну.

Без цяжкасці можна ўявіць, што значыць для горада ў 16 тысяч насельніцтва дзве-тры сотні новых беспрацоўных. А яшчэ пусты гандлёвы рынак. Калі раней там было больш за сотню гандлёвых палатак, то ў мінулую суботу працавалі толькі чатыры. Прадпрымальнікі ўжо таксама сталі беспрацоўнымі. Акрамя таго, ідзе буйнамаштабнае скарачэнне ў «Райаграпрамтэхніцы». Зноў жа без усякай агалоскі, але, па чутках, там будзе звольнена да ста чалавек.

Звольненыя не ўсе пенсіянеры. У Мастах будзе цяжка знайсці працу. А згодна з указам прэзідэнта №202, людзі без працы пераходзяць у катэгорыю «дармаедаў».

Хто стане ўладальнікам ААТ «Мастоўдрэў», пэўна, хутка стане вядома, бо чуткі аб новым гаспадары тут ходзяць даўно.



Раман КАРПЕНКА
Уласны карэспандэнт «ГС» па Зэльвенскім раёне
Email:roma.karpenko.2014@yandex.ru
Тэл: +3751564 3-33-83

Зэльва — наш край

ОТДЫХ

ДОСАДНО. НО ЛАДНО

ТУРНИР РАСТАЯЛ... ВМЕСТО ЛЬДА

В последний момент был отменен открытый чемпионат Зельвенского района по зимнему лову рыбы, намеченный на субботу, 30 января.

Оттепель

Зиму бросило в жар. Последние дни служба МЧС с подозрением посматривала на лед, сковавший Зельвенское водохранилище. Лед таял. А с ним и шансы на проведение традиционного турнира. Обеспокоенные за жизнь и здоровье рыбаков, спасатели настоятельно рекомендовали его организатору, райисполкому, свернуть подготовку к мероприятию. Исполком обиделся (на природу), объявил отсрочку «до приличного мороза» и вышел из игры. А вот любители подледного лова — упрямый рисковый народец — остались на поле.

Субботним утром 30 января Зельвенское водохранилище было усеяно рыбаками, как подсолнух семечками.

200 миллиметров

С первого взгляда на водохранилище стало ясно, что прогнозы МЧС не оправдались: на берегах скопилось приличное количество транспорта, включая автобусы. Но первые шаги на лед репортер «ГС» все же тщательно обдумывал. Каждый метр долго и робко простукивался каблуком. Лед был темным, с тонким налетом воды.

Встречные ловцы потешались. Демонстрировали буры:

— Видите отметку? Толщина льда — 200-250 миллиметров. То есть можно выехать на лед и удить на танке. Ну, чтобы ног не замочить... — приободряли они репортера. Темп марша сразу увеличился. Лавируя между лунками и раскинутыми палатками, стараясь не оборвать натянутую леску, я присоединился к празднику, имя которому — зимняя рыбалка.

Люди не в курсе

Водохранилище почтили своим присутствием ловцы не только местные. На льду развернулась карта Беларуси:

— Мы из Дятлово.

— Мосты. Слоним.

— Волковыск. Щучин. Несвиж.

— Барановичи. Полоцк.

— Бобруйские мы. Водку будешь?

Странно, но о намеченном и отмененном чемпионате по подледному лову почти никто из рыбаков не знал. Что-то слышали, а толком ни гугу... Свободные художники-одиночки и компании из трех-четырех человек приехали сюда лишь потому, что приезжают регулярно. И потому что день блаженный: немного ветреный, но с долгими лучами солнца.

Барановичи рулят

Собственные соревнования в этот день проводил профком Барановичского ЖБК. В Зельву пригнали автобус с пятнадцатью любителями зимней рыбалки от производства. Удобно расположившись на зельвенском льду, от рассвета до заката они мерились уловом в погоне за призами профкома. Наборчики из поплавков, блесны и катушек с леской: подарок скромный, но рыбаку приятный.

Большой рыбы нет

В субботу клевало. Мотыль делал свое дело. Под стук стаканов и хруст соленых огурцов на льду танцевали лещи чуть короче ладони. Подлещик длиннее мизинца. К полудню улов некоторых достигал уже пяти килограммов мелочью. Счастье, если учесть, что рыба с большой буквы у нас в Беларуси — понятие абстрактное. Большую рыбу видят только по телевизору и в холодильниках супермаркета.

Ребята из Полоцка жаловались:

— С этим делом проблемы. Все путевые озера и пруды взяли под ружье. Запустили на развод карпа, щуку. Плати рыбак — уди рыбак. И что? Отдашь 150 тысяч, просидишь до вечера — и кукиш в садке. Цель не оправдывает средства.

Франтишек из Щучина тоже не в восторге:

— В нашем районе негде закинуть крючок. Езжу в Зельву. Здесь хоть леща худого вытянуть можно...

У соседней лунки — Сергей. Каждый выходной он проводит не дома в Дятлово, а на водохранилище в Зельве. Сергей знает о 10-килограммовой щуке, которую вытащили на лед в этом году.

— Десять килограммов? — недоверчиво хлопают ресницами муж с женой из Волковыска, которые тоже специализируются на ловле щуки в Зельве. — Не слышали такого. Ну что ж... прилично для наших краев.



Ледовый натюрморт



В субботу клевало



В поисках лучшего места



Алексей и Пётр представляют в Зельве слонимскую воинскую часть



Вопреки прогнозам МЧС



КАК ЗАЩИТИТЬ СЕБЯ ОТ ОРИ И ГРИППА

Острые респираторные инфекции (ОРИ) — заболевания, которые передаются воздушно-капельным путем и вызываются различными возбудителями: вирусами (аденовирусы, вирусы гриппа, парагриппа, респираторно-сентициальные вирусы и другие) и бактериями (стрептококки, стафилококки, пневмококки и другие).


Прикрывай нос и рот одноразовыми салфетками, когда кашляешь или чихаешь


Немедленно выбрасывай использованные салфетки


Регулярно мой руки с мылом


Если у тебя симптомы, похожие на симптомы гриппа, немедленно обратись к врачу



Если у тебя симптомы, похожие на симптомы гриппа, не приближайся к другим людям ближе чем на 1 метр


Если у тебя симптомы, похожие на симптомы гриппа, оставайся дома. Не ходи на работу, в школу, не посещай общественные места


Избегай объятий, поцелуев и рукопожатий при встречах


Не трогай глаза, нос или рот немытыми руками



В основном возбудители острых респираторных инфекций передаются от человека к человеку через кашель или чихание больного. Любой человек, близко (приблизительно на расстоянии 1 метра) контактирующий с другим человеком с симптомами ОРИ (высокая температура, чихание, кашель, насморк, озноб, боль в мышцах), подвергается риску воздействия потенциально инфекционных вдыхаемых капель. Вирусы могут попасть в организм (глаза, нос или рот) через руки при соприкосновении с инфицированной поверхностью. С помощью соблюдения личной гигиены можно предупредить распространение возбудителей, вызывающих респираторные инфекции.

Основные рекомендации для населения

Избегайте близкого контакта с людьми, которые кажутся нездоровыми, обнаруживают явления жара (температуры) и кашель.

Избегайте многолюдных мест или сократите время пребывания в многолюдных местах.

Старайтесь не прикасаться ко рту и носу.

Соблюдайте гигиену рук — чаще мойте руки водой с мылом или используйте средство для дезинфекции рук на спиртовой основе, особенно в случае прикосновения ко рту, носу.

Увеличьте приток свежего воздуха в жилые помещения, как можно чаще открывайте окна.

Используйте защитные маски при контакте с больным человеком.

Придерживайтесь здорового образа жизни: полноценный сон, рациональное питание, физическая активность, регулярные прогулки на свежем воздухе.

Рекомендации по уходу за больным дома

Изолируйте больного от других, по крайней мере на расстоянии не менее 1 метра от окружающих.

Прикрывайте свой рот и нос при осуществлении ухода за больным с использованием масок.

Тщательно мойте руки водой с мылом после каждого контакта с больным. Выделите отдельные полотенца каждому члену семьи.

Кроме лиц, осуществляющих уход, больного не должны посещать другие посетители.

По возможности только один взрослый в доме должен осуществлять уход за больным.

Беременным женщинам не рекомендуется ухаживать за больным.

Постоянно проветривайте помещение, в котором находится больной.

Содержите помещение в чистоте, используя моющие средства.

Рекомендации для лиц с симптомами ОРИ

При плохом самочувствии следует оставаться дома и выполнять рекомендации врача, по возможности держаться от здоровых людей на расстоянии (1 метр).

Отдыхайте, принимайте большое количество жидкости.

Закрывайте рот и нос при кашле или чихании носовым платком или одноразовыми салфетками. Утилизируйте этот материал сразу после использования или стирайте его и проглаживайте утюгом.

Мойте руки сразу после контакта с выделениями из дыхательных путей!

Носите маску, если находитесь на общей территории дома поблизости от других людей.

Сообщите своим близким и друзьям о болезни.

Рекомендации по использованию масок

Ношение масок обязательно для лиц, имеющих тесный контакт с больным пациентом.

Аккуратно надевайте маску, чтобы она закрывала рот и нос, и завязывайте ее, чтобы пространство между лицом и маской было как можно меньше.

При использовании маски старайтесь не прикасаться к ней.

Прикоснувшись к использованной маске, например, при снятии, вымойте руки водой с мылом или с использованием средств для дезинфекции рук на спиртовой основе.

Заменяйте использованную маску на новую, как только использованная маска станет сырой (влажной).

Не используйте повторно одноразовые маски.

Выбрасывайте одноразовые маски после каждого использования и утилизируйте их сразу после снятия.

Рекомендации для родителей

Научите детей часто мыть руки с мылом в течение 20 секунд. Родители тоже должны выполнять эту процедуру, что послужит хорошим примером для детей.

Научите детей кашлять и чихать в салфетку или, при отсутствии салфетки, в изгиб локтя.

Рекомендуйте детям не подходить к больным ближе чем на полтора-два метра.

Заболевшие дети должны оставаться дома (не посещать дошкольные учреждения и школы).

Воздержитесь от частых посещений мест скопления людей.

Если ребенок контактировал с больным гриппом, проконсультируйтесь с врачом о необходимости приема антивирусных средств для предупреждения заболевания.

Что делать, если ребёнок заболел?

При заболевании ребенка обратитесь за медицинской помощью к врачу, вызывайте врача на дом.

Давайте ребенку много жидкости (сок, воду).

Создайте ребенку комфортные условия, успокойте его.

Выполняйте рекомендации врача.

Держите салфетки и корзину для использованных салфеток на расстоянии, удобном для больного.

Меры профилактики гриппа и других острых респираторных инфекций

На современном этапе наиболее эффективным средством профилактики гриппа является иммунизация. В Республике Беларусь профилактические прививки против гриппа проводятся в соответствии с рекомендациями ВОЗ, согласно которым в первую очередь необходимо проводить иммунизацию против гриппа, прежде всего среди лиц из групп высокого риска заражения и последствий от гриппозной инфекции.

После вакцинации или перенесенного гриппа в организме формируются защитные антитела, однако они сохраняются чуть более полугода, а затем разрушаются. Когда в следующем году приходит новый вариант вируса гриппа, то он вновь «застает врасплох» нашу иммунную систему и мы снова болеем.



Страницу подготовила Анна ВОЛОДАЩУК

МИНИ-ФУТБОЛ

СЛОНИМЧАНЕ УСТУПИЛИ В СПАРРИНГЕ



Момент игры

На минувшей неделе в спорткомплексе ДЮСШ №1 состоялся товарищеский матч юношей 2007 г.р.

К юным слонимчанам, которых тренирует Руслан Корнев, на спарринг приехали ребята из Барановичей.

Ожесточенная борьба на площадке принесла успех гостям. Но наши юноши жаждут реванша.

Николай РОДИОНОВ
Фото автора

ТУРНИР ПО МИНИ-ФУТБОЛУ SLONIM CUP

ПРОИГРАЛИ ЛИШЬ В ФИНАЛЕ

В городском спорткомплексе ДЮСШ №1 состоялся турнир по мини-футболу Slonim Cup среди юношей 2001 г. р.

В соревнованиях участвовало шесть команд, которые 30 и 31 января сыграли между собой в один круг.

Слонимскую ДЮСШ №1 представляли игроки двух возрастов — 2001 г. р. и вне конкурса 2000 г. р.

Накал страстей развернулся с первых встреч, но не принёс неожиданных результатов. Выше уровнем команды Слонима и Барановичей свои первые встречи выиграли. Слонимчане обыграли сверстников из Ивацевичей — 7:1, а барановичские спортсмены взяли верх над командой из Берёзы 2:1.

Второй тур опять без потерь прошли вышеназванные команды. Команда под руководством Руслана Корнева одержала уверенные победы над командами Берёзы — 4:2, затем были повержены юные футболисты из Пружан — 11:0, в свою очередь барановичские спортсмены уступили команде из Ивацевичей — 3:4.

Очный поединок команд Слонима и Барановичей принёс успех приезжим футболистам — 2:4. Игра сложилась для слонимчан неудачно: не получались коллективные действия, соперники старались играть на контратаках, что и принесло им желаемый результат.

Команды-призёры были удостоены наград, а лучшие игроки получили ценные призы. В составах команд Слонимщины таковыми стали Дмитрий Близнюк (ДЮСШ №1 2001 г. р.), Артём Макаревич в составе команды 2000 г. р.

Егор ЖИГАЛИК
Фото автора



Мяч у вратаря



Поединок



В атаке

МИНИ-ФУТБОЛ

ОТВЕТ ПОЛУЧИМ ЧЕРЕЗ НЕДЕЛЮ

«ЭНЕРГИЯ» (ЗЕЛЬВА) — «ФОРСАЖ» (СЛОНИМ) — 3:1 (1:1)
31 января. г.п. Зельва, спортивный зал СШ №3, 130 зрителей.
Судьи — В. Ракса, Ал. Обелевский (оба Гродно).
Гол у слонимчан: Николай Добриян, 16-я мин.
Фолы: 4:3, 5:5.
«Форсаж»: Комлев – Добриян, Кутищев, Молчанов (к), Пузач, Дегиль, Берг Влад., Сушко, Петрашко, Нагорный, Артюх, Тарасюк.
Тренер — Руслан Корнев.

На предстоящий матч слонимчане отправились без нескольких игроков основного состава. Сама игра носила принципиальный характер. «Форсаж» борется за попадание в шестёрку сильнейших команд области.

Увы, оступились и отложили решение на последний матч, который пройдёт 7 февраля в Слониме.

Данная встреча прошла на довольно хорошем уровне. Команды показали быстрые передвижения, создали много угроз воротам, вот только реализация со стороны слонимчан хромала на обе ноги. Чуть ли не весь состав гостей имел возможность (а кто-то и несколько раз) поразить ворота. В отличие от слонимчан, хозяева сумели правильно распорядиться теми моментами, которые создавали.

Счёт первыми открыли приезжие футболисты. После активных действий у ворот «Энергии» Александр Пузач вывел на ударную позицию Николая Добрияна — 0:1. Вскоре возник ещё один голевой эпизод, но Пузач вместо передачи Александру Нагорному решил сам пробить — мимо. Ещё в одной из атак удар Сергея Кутищева на себя принял голкипер. Появился момент у хозяев, и они его использовали — 1:1. Слонимчане приложили много старания, чтобы переломить ход поединка в свою сторону, но фортуна отвернулась от них. Ещё до перерыва как минимум трижды гости могли забить, но не сумели.

Вторая половина игры прошла ещё в более высоком темпе. Хозяева закрылись целым составом на своей половине и делали лишь разящие контратаки. «Форсажу» ничего не оставалось, как идти вперёд. Но всё было тщетно. Тут вновь вспомнились нереализованные моменты первого тайма, а во втором их было наполовину меньше. Но всё равно были, а вот голов забить не сумели.

Ждём последний матч, в котором нужна только победа.

Егор ЖИГАЛИК

АФИША СПОРТИВНОЙ НЕДЕЛИ

2-5 февраля

Мини-футбол. Турнир среди любительских команд района. «Кубок «Форсажа-2016». Спорткомплекс ДЮСШ №1. Начало в 19.00.

6-7 февраля

Республиканский турнир по мини-футболу среди мальчиков 2004 года рождения. Спорткомплекс ДЮСШ №1. Начало 6 февраля в 11.00.

7 февраля

Мини-футбол. Чемпионат Гродненской области. «Форсаж» (Слоним) — ФСК «Гродненский» (Скидель). Спорткомплекс ДЮСШ №1. Начало 7 февраля в 15.30.

Егор ЖИГАЛИК

СКАНВОРД

Разгадайте сканворд и тогда в выделенных горизонталях прочитаете фразу-пароль

Древнейшее насекомое · Историческая область в Испании · Погонщик телят · Рассказ Чехова · Анод (сравни) · Базарная единица · Арабская флейта · Ивовый кустарник · Бегун по проводам · Фруктовый напиток · Женский убор · Столик для икон · Ученый под дубом · Стих Некрасова · Четки в индуизме · Обутая конечность · Матрос на «Беде» · Искусство братьев Люмьер · Плачет из-за мячика · Драг. камень · Укр. парламент · Буква кириллицы · Стяг · У Бендера она пишет · Напиток · Круги вокруг солнца · Верблюжий метис · Мать у казаха · Имя мульт. крокодила · ЗиЛ до Лихачева · Дерево на кол вампиру · Суп из свёклы · Цветастый попугай · Антильский журавль · Город в Польше ...-Подляска · Поэма Байрона · Собачий монолог · Столица норвежца · Герой оперы Чайковского «Черевички» · Златоуст за трибуной · Товар на аукционе · Участник корриды · Приливная волна · Греч. буква · Симптом морской болезни · Дом у тюрков · Хозяин камбуза · Напиток пиратов · Время события · Почетное звание · Утенок Диснея · Горный цирк · Прорванное место · Под серединой · Город в Литве · Соотношение красок в картине · Горный курорт в Швейцарии

ФОТО ВЛАДИМИРА ВАШУТЫ

Разгадай сканворд и выиграй пиццу!

НАШИ ПОБЕДИТЕЛИ



Анастасия ТРОФИМЧИК

Друзья, первый, кто пришлет фразу-пароль в SMS-сообщении в пятницу, **5 февраля**, **ПОСЛЕ 15:00:00** (включительно), получит от кафе «101-й этаж» в подарок пиццу! Телефон **8 029 133-04-21.**

Победителем прошлого конкурса стал наш читатель с номером **+375 29 56ххх37** (победное SMS-сообщение пришло 29 января в 15:00:01). С победителем мы свяжемся сами.

Уважаемые читатели! Внимательно читайте условия конкурса и не присылайте SMS-сообщения в другие дни.

ИЩУ ТЕБЯ

РОДСТВЕННИКИ ИЩУТ СЛЕДЫ СТАНИСЛАВА ВРАЖЕНЯ

«Мой дед Станислав Вражень был сержантом 80-го или 79-го пехотного полка в Слониме. У меня есть несколько снимков. Знаю, что в доме, где он квартировал, жил солдат по имен Хак, татарин по происхождению, который после войны жил в польском городе Валбжихе. Дед в сентябре был взят в плен, находился в лагере в Луккенвальде».

Полина ПЛЕШКО

P.S. Уважаемые читатели! Если Вы хотите найти кого-то из своих родных, друзей, знакомых, обращайтесь в нашу рубрику «Ищу тебя». Мы поместим Ваше послание на страницах «ГС», сайте издания и в соцсетях. А также обязательно пишите или звоните нам, если Вам что-то известно о людях, которых ищут в нашей рубрике: тел. 8 029 133-04-21, e-mail zhannapleshko@gmail.com

РЭТРАФОТА



Карціна нямецкага мастака Макса Кларэнбаха (1880-1952), "Салдаты на часовым мосце праз Шчару", 1916 год, алей

ВІКТАРЫНА «ЛЕТАПІСНЫ СЛОНІМ»

АД ВАСІЛЯ ГЕРАСІМЧЫКА

Паважаныя сябры! Прапануем вам чарговую віктарыну пра гісторыю Слоніма, якую падрыхтаваў слонімскі гісторык Васіль Герасімчык.





Такі падарунак чакае пераможцу віктарыны

Віктарына складаецца з 10 пытанняў. За правільны адказ будзе налічацца 1 бал. Пераможца — той, хто набярэ найбольш балаў, атрымае падарунак — кубак з гербам Слоніма і кнігу Сяргея Чыгрына «125 пытанняў і адказаў з гісторыі Слонімшчыны».

№2 **Назавіце імя аднаго са слонімскіх князёў, заснавальніка Лаўрышаўскага манастыра, які прыняў сан. Ён вымушаны быў зняць манаскі строй, каб адпомсціць за смерць бацькі і ўзначаліць Вялікае княства Літоўскае.**

УВАГА! Адказ на пытанне трэба даслаць у SMS-паведамленні да **12 гадзін** панядзелка, **8 лютага**, на нумар **8 029 133-04-21** (не забудзьце напісаць сваё імя і прозвішча). Таксама можна проста патэлефанаваць на гэты нумар і агучыць свой адказ ці даслаць адказ да ўказанага часу на электронную пошту **zhannapleshko@gmail.com**

Адказ на пытанне №1 «Як называецца наш горад Слонім у першай сваёй летапіснай згадцы пра паход на яго і суседнія Ваўкавыск і Здзітаў галіцкіх князёў?» — **Услонім.**

Вынікі першага этапу:

Людміла ХАРШУНОВА	1 бал
Наталля БАКУНОВА	1 бал
Анастасія ТРАФІМЧЫК	1 бал
Галіна БАРЫСІК	1 бал

Старонку падрыхтавала Жанна ІВАНОВА

ЦІКАВАЯ ГІСТОРЫЯ



Аднаго разу Рыжы Мураш прачытаў у кнізе, як кропелька вады ўлетку падарожнічала. Спачатку яна разам з сяброўкамі ў дажджавой хмарцы жыла. Потым у возера ўпала, крыху пагуляла там і зноў да хмаркі, нібыта імклівая птушка, паляцела.

«Цікавая гісторыя», — загарнуўшы кнігу, зазначыў пра сябе Рыжы Мураш і вырашыў пра гэтую гісторыю суседзям расказаць. Няхай ведаюць суседзі, што ён не толькі працуе, але і кнігі чытае ў вольны час.

Выйшаў Рыжы Мураш на двор.

— Добры дзень, сусед, — прывітаўся з Рыжым Мурашом Мядзведзь.

Рыжы Мураш падышоў да Мядзведзя і пачаў расказваць яму пра кропельку.

— Цікавая гісторыя! — выслухаўшы рыжага Мураша, зазначыў Мядзведзь.

Затым Рыжы Мураш Зайца ўбачыў. І яму пра кропельку расказаў. Уважліва выслухаў яго Заяц і прамовіў:

— Цікавая гісторыя!

На другі дзень Рыжы Мураш зноў запыніў Мядзведзя і Зайца, каб пра кропельку расказаць. А яны чамусьці скрывіліся, не захацелі яго слухаць.

— Вам нецікавая гэтая гісторыя? — запытаўся ў суседзяў Рыжы Мураш.

— Нецікавая! — пераглянуўшыся, прагаварылі Мядзведзь і Заяц і таропка пакрочылі.

Стаіць Рыжы Мураш, лапкамі разводзіць, не можа зразумець, чаму цікавая гісторыя раптам стала нецікавай.

Аляксей ЯКІМОВІЧ

КРАІНА КАЗАК З`ЯВІЛАСЯ НА GOOGLE PLAY



«Краіна казак» — праграма, якая аб`ядноўвае ў сабе дзіцячыя кнігі, песні і калыханкі, з`явілася на Google Play.

Карыстальнікі мабільных прылад на базе «Android`у» могуць бясплатна спампаваць цэлую кніжную палічку праілюстраваных ды агучаных кніг на беларускай мове.

Для самых маленькіх — некалькі дзясяткаў беларускіх калыханак: сучасных і аўтэнтычных, улюбёных і малавядомых.

Бацькі змогуць не толькі выкарыстаць плэер і праслухаць спевы разам з дзецьмі, але і прачытаць словы, вывучыць іх, каб наступным разам праспяваць калыханку самім.

Спампаваць праграму можна з Google Play (https://play.google.com/store/apps/details?id=org.alex73.android.dzietkam)

Стваральнікі «Краіны казак» плануюць дапрацоўваць і развіваць праграму. Кожны можа дапамагчы заўвагамі ды прапановамі, даслаўшы іх на адрас kazki@googlegroups.com


Сваім меркаваннем можна падзяліцца, адказаўшы на некалькі пытанняў на http://goo.gl/forms/lXqLiFZNQr

Нагадаем, што для карыстальнікаў iPad існуе праграма «Кнігі дзеткам» з праілюстраванымі і агучанымі кнігамі на беларускай мове, якія таксама дасяжныя для спампоўвання задарма


https://itunes.apple.com/by/app/knigi-dzetkam/id786269247?mt=8

Таццяна ПЛАХЕТКА

СКАНВОРД С КАРТИНКАМИ



КАК НАРИСОВАТЬ ЧЕРЕПАХУ?



А ВЫ ЗНАЛИ, ЧТО...



— в среднем дети смеются около 400 раз в день, взрослые смеются около 15 раз в день.

— в среднем человек засыпает в течение 7 минут.

— дети в возрасте от 1 до 3 месяцев плачут без слёз.

— люди с голубыми глазами лучше видят в темноте.

— люди, которые вам лгут, смотрят вверх-влево.

— в течение жизни мы съедаем около 27 тонн пищи, что равно весу семи слонов.

— весной дети растут быстрее, чем в другие времена года.

— все белые медведи — левши.

— слоны – единственные животные, которые не могут прыгать.

Старонку падрыхтавала Таццяна ПЛАХЕТКА

Намеснік галоўнага рэдактара
Мікола КАНАНОВІЧ
Журналісты
Уладзімір ШУМЕЛЬ
Яўген ВАЛАДАШЧУК
Таццяна ДЗЕНІСЮК
Алена КАСЦЮК
Стыль-рэдактар
Жанна ПЛЕШКО
Рэдакцыя сайта www.gs.by
Рэдактар
Дзмітрый МІЦКЕВІЧ
Спецыяліст па рэкламе
Наталля ЦАРОВА

Галоўны бухгалтар
Ганна ВАРАНОВІЧ
Бухгалтар
Вольга БУРСЕВІЧ
Аддзел падпіскі і продажу
Аляксей НАВІЦКІ
8-(029) 322-06-42
Вёрстка і дызайн
Віталь ЕМЯЛЬЯНАЎ
Сяргей РЭКУН

Тэлефоны рэдакцыі:
т/факс: **8 (01562) 29-999,**
Тэл. 6-36-58, 6-36-68, 6-36-54, 6-36-44.
МТС: **8-029-584-87-32**
Velcom: **8-029-133-04-21**
Skype — gazslon
(9.00-18.00)
Для карэспандэнцыі:
231799, г. Слонім,
вул. Чырвонаармейская, д. 41
e-mail: gs@gs.by,
gazslon@gmail.com

Рэкламная служба
Начальнік рэкламнай службы
Ганна ВАЛАДАШЧУК
anna@gs.by
8-(029) 612-26-43
Супрацоўнікі
Наталля СТРУПАВЕЦ
Людміла КАМЯНЕЦКАЯ
Ірына ФРАНОВІЧ
8-(044) 715-90-03
8-(01562) 6-60-56
(9.00–16.00)
т/факс:
8-(01562) 29-000

Прыём аб'яў і падпіска:
г. Слонім, Чырвонаармейская, 73 Б
(будынак АРЗ)
Працуем аўторак — пятніца 8^{00}-17^{00}
субота — нядзеля 9^{00}-15^{00}
выхадны — панядзелак
8-(044) 762-48-39

погода на неделю

	утро	день	вечер
СРЕДА, 3 февраля	5^0	5^0	3^0
ЧЕТВЕРГ, 4 февраля	2^0	2^0	1^0
ПЯТНИЦА, 5 февраля	-1^0	1^0	0^0
СУББОТА, 6 февраля	1^0	4^0	4^0
ВОСКРЕСЕНЬЕ, 7 февраля	2^0	5^0	5^0
ПОНЕДЕЛЬНИК, 8 февраля	4^0	7^0	6^0
ВТОРНИК, 9 февраля	6^0	7^0	3^0
СРЕДА, 10 февраля	4^0	6^0	2^0

www.meteoprog.by

ЗАДАЙ ВОПРОС РУКОВОДСТВУ

В феврале по субботам прямые телефонные линии проведут должностные лица Слонимского райисполкома. Об этом сообщает сайт райисполкома.

6 февраля слонимчан выслушает управляющий делами Слонимского районного исполнительного комитета Елена Никодимовна Мачалина.

13 февраля на прямой телефонной линии будет дежурить заместитель председателя Слонимского районного исполнительного комитета Владимир Владимирович Кот.

20 февраля отвечать на вопросы будет председатель Слонимского районного исполнительного комитета Олег Мечиславович Таргонский.

27 февраля обсудить вопросы можно будет с первым заместителем председателя Слонимского районного исполнительного комитета Василием Евстратовичем Семеновым.

Время проведения прямых телефонных линий — с 9 до 12 часов. Обращаться по телефону 5-03-11.

Татьяна ПЛАХЕТКО

ВУЛІЦЫ РОДНАГА ГОРАДА:

ПАЗНАЙ МЕСЦА І АТРЫМАЙ ПРЫЗ!



Адказ на мінулае заданне: Дом №66 на Чырвонаармейскай вуліцы



Што гэта? Дзе гэта?

Сябры, калі вы пазналі, што за пабудова адлюстравана на фотаздымку, шліце адказ у SMS-паведамленні на нумар **8 029 133-04-21**. Неабходна ўказаць назву пабудовы ці яе адрас — вуліцу і нумар.

Пераможца конкурсу — той, хто прышле правільны адказ першым **у ПЯТНІЦУ, 5 лютага, пасля 14:00:00 (уключна),** — атрымае ўпадарунак піцу ад рэстарана «Залаты Фенікс».

Паважаныя чытачы! Уважліва чытайце ўмовы конкурсу і не дасылайце адказы ў іншыя дні.

Пераможцам мінулага конкурсу стаў наш чытач з нумарам **+375 29 14xxx51** (пераможнае SMS-паведамленне прыйшло 29 студзеня ў 14:00:03).

Жанна ІВАНОВА
Фота аўтара

НАШЫ ПЕРАМОЖЦЫ



Андрус СУУДЭР

Дзякуй за тое, што выбралі "Газету Слонімскую"!

Галоўны рэдактар Віктар Уладзіміравіч Валадашчук, victor@gs.by

ЗАСНАВАЛЬНІК **Віктар Уладзіміравіч ВАЛАДАШЧУК**

Газета друкуецца на беларускай і рускай мовах

Рэгістрацыйнае пасведчанне №64 ад **05.03**.2009 года. выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Свидетельство о госрегистрации УП "Газета Слонимская" ЮКЛ № 001845, выданное Гродненским областным исполнительным комитетом от **03.04**.2003 г.

email: gs@gs.by
gazslon@gmail.com
Юрыдычны адрас: 231800, г.Слонім, вул. Чырвонаармейская, 41
Тыраж: 3500

Падпісныя індэксы:
64042 (індывідуальная)
63818 (ведамасная)
63646 (льготная)
Свабодны кошт

Час падпісання да друку па графіку 2 лютага 2016 года **16:00**.
Аб'ём — шэсць умоўных друкаваных аркушаў.

Надрукавана ў друкарні ГАУПП "Гродзенская друкарня" г.Гродна, вул. Паліграфістаў, 4, індэкс 230025.
Заказ № 584